# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА» У МЕДЫЦЫНСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МЕДЫЦЫНСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА)

**Пусташыла А. П., Садоўская З. Я.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь выкладаецца дысцыпліна «Беларуская мова: прафесійная лексіка» для студэнтаў розных спецыяльнасцей, накіраваная на авалоданне беларускамоўнай спецыяльнай тэрміналагічнай лексікай у межах абранага профілю навучання ва ўмовах білінгвізму, на развіцце ўменняў «лагічна і паслядоўна выкладаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай формах, а таксама пісьменна карыстацца маўленчымі стылістычнымі навыкамі» [1].

У вучэбнай праграме дадзенай дысцыпліны для стуэнтаў спецыяльнасці «Медыка-дыягнастычная справа» Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта (ГрДМУ) адзначаецца: «Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова: прафесійная лексіка» ставіць за мэту навучыць студэнтаў медыцынскага ўніверсітэта карыстацца беларускамоўнай медыцынскай тэрміналогіяй, засвоіць навуковы стыль мовы, свабодна валодаць вуснай і пісьмовай формамі літаратурнай мовы. Праграма вучэбнай дысцыпліны складзена з улікам патрабаванняў гуманітарызацыі навучання ва ўстановах адукацыі. Яна павінна садзейнічаць фарміраванню прафесійных і гуманістычных якасцей будучага ўрача-спецыяліста, далучэнню яго да багаццяў нацыянальнай культуры і навукі» [1].

Спецыяліст-медык, які атрымоўвае вышэйшую адукацыю ў Рэспубліцы Беларусь, павінен быць:

– патрыетам, грамадзянінам, які з шанаваннем і павагай ставіцца да сваей роднай мовы, ведае яе месца ў сістэме іншых моў свету, этапы яе станаўлення і развіцця, асаблівасці сучаснай моўнай сітуацыі ў краіне, валодае вуснай і пісьмовай формамі беларускай мовы ў межах розных маўленчых стыляў;

– знаўцам, прафесіяналам, які ведае ўласнабеларускую медыцынскую тэрміналогію, можа размаўляць і дасягаць узаемаразумення з пацыентамі розных мясцовасцей нашай кріны.

Менавіта на дасягненне гэтых вынікаў накіравана выкладанне дысцыпліны «Беларуская мова: прафесійная лексіка» у ГрДМУ.

Асаблівая ўвага ў выкладанні дадзенай дысцыпліны надаецца навуковаму стылю і сістэме моўных сродкаў, марфалагічным і сінтаксічным асаблівасцям, сістэме жанраў і кампазіцыйна-структурнай арганізацыі навуковых тэкстаў. Усім студэнтам прапануецца падрыхтаваць і абараніць рэферат па агульнай тэматыцы «Мая малая радзіма». Кожны студэнт павінен абраць

Рэпозиторий ГрГМУ

у межах гэтай тэматыкі ўласны прадмет даследвання і ў выніку крытычнага агляду літаратуры прааналізаваць розныя пункты гледжання на вызначаную праблему з выказваннем сваей пазіцыі і ацэнкі. Рэферат, як кожны жанр навуковага стылю, мае свае патрабаванні з дакладнымі ўмовамі яго афармлення, якія прад'яўляюцца студэнтам да пачатку яго падрыхтоўкі [2].

У межах названай дысцыпліны важнае месца таксама займае праца з медыцынскай тэрміналогіяй. Акрэсліваюцца два магістральныя накірункі ў развіцці беларускай медыцынскай тэрміналогіі: утварэнне тэрмінаў на аснове беларускай размоўнай лексікі (*сцягно, страўнік, брухавіна, запаленне, трызненне*) і на аснове грэчаска-лацінскіх тэрмінаэлементаў праз іх адаптацыю да нормаў беларускай мовы (*абдамінальны, інфекцыя, медыцына, сімптом, вакцына*). Вялікі ўплыў на сучасную беларускую медыцынскую тэрміналогію таксама аказвае руская мова.

Веданне медыцынскай тэрміналогіі замацоўваецца падчас напісання зваротных дыктовак, перакладаў навуковых і навукова-папулярных тэкстаў з рускай на беларускую мову і, наадварот, з беларускай на рускую мову.

Валоданне вуснай формай беларускай мовы ў галіне прафесійнай лексікі выпрацоўваецца праз вуснае апытанне па тэме заняткаў, пераказ, складанне дыялогаў «урач – пацыент» па прапанаваных гісторыях захворвання.

Акрамя таго, для студэнатаў рэкамендаваны тэрміналагічны мінімум – спіс тэрмінаў для абавязковага завучвання [3]. Веданне тэрміналагічнага мінімуму (у аб'еме не меней за 60 %) – адна з умоў атрымання адзнакі «залічана» па выніках бягучай атэстацыі нараўне з падрыхтоўкай і абаронай рэферата і напісаннем перакладу навуковага тэксту на станоўчую адзнаку [4].

З мэтай фарміравання прафесійных і гуманістычных якасцей будучых урачоў-спецыялістаў, далучэння іх да багацця нацыянальнай культуры ў рамках дысцыпліны «Беларуская мова: прафесійная лексіка» запланавана наведванне музеяў: універсітэцкага музея беларускай этнаграфіі, створанага на кафедры рускай і беларускай моў рукамі выкладчыкаў і студэнтаў ГрДМУ [5], і музея Максіма Багдановіча ў Гродне.

Такім чынам, выкладанне дысцыпліны «Беларуская мова: прафесійная лексіка», з аднаго боку, спрыяе атрыманню студэнтамі-медыкамі тэарытычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў у галіне медыцынскай прафесійнай лексікі, з другога боку, садзейнічае набыццю імі «якасцей патрыетаў і грамадзян, гатовых да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны» [1].

Літаратура:

1. Беларуская мова: прафесійная лексіка : вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 7-07-0911-04 «Медыка-дыягнастычная справа» // Электронны вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» для спецыяльнасці 7-07-0911-04 «Медыка-дыягнастычная справа». – 2025. – URL:



Рэпазіторый ГрДМУ

http://edu.grsmu.by/pluginfile.php/143888/mod_resource/content/3/Беларуская мова_праграма МДФ_2025.pdf (дата звароту: 09.11.2025).
2. Патрабаванні да рэферата // Электронны вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» для спецыяльнасці 7-07-0911-04 «Медыка-дыягнастычная справа». – 2025. – URL: http://edu.grsmu.by/pluginfile.php/210406/mod_resource/content/4/Патрабаванні да рэферата.pdf (дата звароту: 09.11.2025).
3. Тэрміналагічны мінімум // Электронны вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» для спецыяльнасці 7-07-0911-04 «Медыка-дыягнастычная справа». – 2025. – URL: http://edu.grsmu.by/pluginfile.php/20373/mod_resource/content/4/Тэрміналагічны мінімум_01.02.25.pdf (дата звароту: 09.11.2025).
4. Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт» па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка» // Электронны вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» для спецыяльнасці 7-07-0911-04 «Медыка-дыягнастычная справа». – 2025. – URL: http://edu.grsmu.by/pluginfile.php/20372/mod_resource/content/5/Критерии_ Бел.яз_студенты.pdf (дата звароту: 09.11.2025).
5. Музей беларускай этнаграфіі // Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт : афіц. сайт. – URL: http://www.grsmu.by/ru/university/about/museum/museum_etnografii/ (дата звароту: 09.11.2025).

## ЯЗЫКОВЫЕ И КОММУНИКАТИВНЫЕ ПОТРЕБНОСТИ СТУДЕНТОВ МЕДИЦИНСКИХ СПЕЦИАЛЬНОСТЕЙ ПРИ ОСВОЕНИИ УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ «ИНОСТРАННЫЙ ЯЗЫК»

**Разводовская Я. В.**

Гродненский государственный медицинский университет
г. Гродно, Республика Беларусь

Содержание обучения иноязычному профессионально-ориентированному общению в сфере медицины требует постоянной оптимизации в связи с появлением новых функций и коммуникативных потребностей представителей медицинской профессии [1; 2]. Коммуникация современного врача с использованием иностранного языка включает не только ситуации сугубо профессионального общения с коллегами, но и коммуникацию с научным сообществом и пациентами в форме онлайн / мобильной формы взаимодействия, телекоммуникации, просветительской и рекламной деятельности и пр. [3, с. 322].

Помимо выделенных актуальных коммуникативных потребностей современного врача, немаловажным фактором при оптимизации содержания



Репозиторий ГрГМУ